**Булаты П.Ю.**

# АБАРОНА ЛЯХАВІЦКАЙ ФАРТЭЦЫІ 1660 Г. НА СТАРОНКАХ ДЫЯРЫУШУ Я.А. ХРАПАВІЦКАГА

Ян Антоні Храпавіцкі (1612–1685) – прадстаўнік сярэдняй па заможнасці шляхты, які зрабіў выдатную палітычную кар'еру, па прыкладзе выбітных асоб сваёй эпохі, вёў дзённік, дзе занатоўваў штодзённыя падзеі перыяду з 1658 па 1685 гг. [6, с. 21–22].

Дыярыуш Храпавіцкага – каштоўная гістарычная крыніца, на старонках якой адлюстраванае палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай друг. пал. XVII ст., праца соймаў, штодзённае жыццё заможнай шляхты, звычаі і норавы, заўвагі аб надвор'і [6, с. 21–22]. Адной са значных падзей, якая прыпала на жыццё Храпавіцкага і, натуральна, знайшла адлюстраванне на старонках дзённіка, з'яўляецца вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай 1654–1667 гг. Важным і вырашальным момантам вайны была кампанія, якая разгортвалася ў паветах Вялікага Княства Літоўскага ў 1660 г.

Перыяд зімы 1659 г. і зімы-вясны 1660 г. праходзіў галоўным чынам пад знакам дзеянняў маскоўскіх палкоў Івана Хаванскага. Яго войскі, якія налічвалі да 9 тыс. чалавек [4, с. 27], прыйшоўшы на Падляшша, імкліва прасоўваліся ў кірунку Любліна і Варшавы. Але канчатковае авалоданне маскоўскім войскам землямі ВКЛ і выпраўленне ў Карону было немагчымае без заняцця апошніх асяродкаў супраціву – крэпасцей Ляхавічы, Нясвіж і Слуцк [3, с. 153]. Пры існуючай на той час вайсковай сістэме армія цалкам залежала ад таго, наколькі правільна было наладжанае забеспячэнне войска. У сувязі з гэтым небяспека збоку гарнізонаў крэпасцей не дазваляў войску, якое ішло ў наступ, пакідаць не ўзятыя ўмацаванні, якія знаходзіліся на асноўных аператыўных камунікацыях [2]. У сувязі з гэтым І. Хаванскі з Падляшша ўзімку 1660 г. з галоўнымі сваімі войскамі павярнуў назад у Наваградскі павет. Манеўры маскоўскага войска і падзеі, якія разгортваліся каля апошніх асяродкаў супраціву, прыкоўвалі да сябе ўвагу жыхароў Рэчы Паспалітай.

Досыць падрабязна рух Хаванскага ў вайсковай кампаніі 1660 г. апісаныя на старонках дзённіка Яна Храпавіцкага. Цягам студзеня 1660 г., пачынаючы ад моманту, калі маскоўскія сілы сталі лагерам у Забулдове і вырашалі напрамак далейшых манеўраў, Храпавіцкі амаль штодня занатоўваў звесткі, якія датычыліся вайсковых падзей, якія аўтар называў «*trwogi wielkie od Moskwy* [5, с. 219]». У студзеньскіх і лютаўскіх зацемках адлюстраваныя перамяшчэнні палкоў Хаванскага на Падляшшы, падыход да Брэста і паспяховы для маскоўцаў штурм замка.

Напрыканцы лютага ў дзённікавых запісах Я. А. Храпавіцкага ўпершыню згадваюцца Ляхавічы. У запісу ад 24 лютага Храпавіцкі адзначае: «*Прыйшло паведамленне, што Хаванскі мінуў Ляхавічы і пайшоў глыбей на Літву* [5, с. 227]». Як адзначалася вышэй, далейшаму прасоўванню на захад Хаванскаму перашкаджалі нескароныя крэпасці. У першую чаргу ваявода вырашыў здабыць Ляхавічы. У данясенні цару Аляксею Міхайлавічу маскоўскі вайскаводца вызначаў стратэгічную ролю Ляхавіцкай фартэцыі і значнасці яе захопу: «*А не учиняя промыслу над Ляховичами, отойти… отнюдь нельзя, потому что Ляховичи стали промеж твоих завоёванных городов…* [1, с. 65]». І далей Хаванскі выказваў засцярогу, што гарнізон крэпасці будзе перашкодаю на шляху войска цара. Аб сваім падыходзе пад Ляхавічы ў лютым Хаванскі таксама дакладаў цару: «*и пришли мы подъ Ляховичи и Ляховичи осадили* [1, с. 61]». Але ў той час пад Ляхавічамі Хаванскі доўга не затрымаўся: расклад сіл і шэраг знешніх фактараў абумовілі яго выправу ў Наваградак, а адтуль імклівы рэйд зноў на Падляшша, адкуль у сакавіку палкоўнік выправіўся зноў у Наваградскі павет здабываць крэпасці.

Аб рэйдзе Хаванскага на Падляшша маецца датаваны 13 сакавіка запіс Храпавіцкага: «*Прыйшло некаторае паведамленне, што Хаванскі, папаліўшы Падляшша за Бугам пайшоў да Ляхавічаў* [5, с. 231]». У заўвагах да гэтага запісу адзначаецца, што першапачаткова на месцы Ляхавічаў значылася Гродна [5, с. 231]. Можна меркаваць і аб супярэчнасці звестак, якія прыходзілі Храпавіцкаму, і аб нечаканасці манеўраў Хаванскага.

Літаральна праз дзень – 15 сакавіка – Храпавіцкі зноў запісаў аб падзеях, якія тычацца падзей каля Ляхавічаў. Ён адзначыў: «*Прыйшло паведамленне, нібыта пан Чарнецкі ваявода рускі меў намер разбіць колькі тысяч маскоўскага войска пад Ляхавічамі, якія там пакінуў Хаванскі,*



Рэпазіторый ВГУ

*калі сам хадзіў з камюніке і наша войска выгнаў з брэсцкага краю* [5, с. 231]». Вынікае, што Хаванскі яшчэ ў лютым усё ж пакінуў пэўныя сілы пад Ляхавічамі, з якімі хацеў уступіць у бой ваявода Чарнецкі. Але згаданыя планы засталіся не рэалізаванымі.

Са сваім войскам Іван Хаванскі прыйшоў пад сцены Ляхавіцкай фартэцыі 23 сакавіка 1660 г., аб чым неадкладна паведаміў цару [1, с. 61]. Аб гэтым даведаўся і Храпавіцкі, які 27 сакавіка адзначыў, што «*Прыйшло паведамленне, што Хаванскі пайшоў за пушчу пад Ляхавічы* [5, с. 233]». Аблога крэпасці зацягнулася да 29 чэрвеня.

Згодна з данясеннямі ваяводы цару, яго галоўнай мэтай было завалодаць Ляхавіцкай фартэцыяй [1, с. 65]. Аб іншых выправах і планах размовы не вялося. Але да Храпавіцкага ад розных асоб паступалі супярэчлівыя і досыць разрозненыя звесткі аб вайсковых планах Хаванскага. Так, 20 сакавіка (яшчэ да таго, як маскоўскае войска падышло пад Ляхавічы) было занатавана, што Хаванскі пайшоў на Палессе да Пінска і Украіны [5, с. 232]. 26 сакавіка адзначаныя планы ваяводы выправіцца ў Барысаў [5, с. 233]. 11-м красавіком адзначаны намер вярнуцца пад Брэст [5, с. 235], а 17-м красавіком – аб выправе ваяводы пад Гродна [5, с. 236]. 28 красавіка паведамляецца аб намеры рушыць да Забулдова [5, с. 238], а 29 красавіка адзначаецца, што Хаванскі з-пад Ляхавічаў выправіўся ў Мінскі край [5, с. 239]. Пра планы Хаванскага ісці пад Брэст зноў паведамляецца ў запісу ад 5 мая [5, с. 240].

Тым не менш, даходзілі да Храпавіцкага і праўдзівыя, хоць часам і не зусім дакладныя, звесткі, якія апісвалі становішча баявых дзеянняў пад Ляхавічамі.

5 красавіка Хаванскі пачаў першы штурм фартэцыі, але пацярпеў няўдачу. Са стратамі, маскоўцам прыйшлося адступіць. Пачалася аблога і шчыльная блакада крэпасці, рыхтаваўся новы штурм [1, с. 64–65].

Гэтыя падзеі на тэатры баявых дзеянняў лаканічна занатаваў Я. А. Храпавіцкі. Так, 11 красавіка было занатавана супярэчлівае паведамленне, «*што Хаванскі перамагае Ляхавічы і задумвае вярнуцца пад Брэст* [5, с. 235]». Адразу ж назаўтра, 12 красавіка Храпавіцкі запісаў ужо іншую ацэнку падзей: «*Прыйшло [паведамленне] паўторна, што Хаванскі штурмаваў і маецца штурмаваць Ляхавічы далей* [5, с. 235]».

Да ляхавіцкіх падзей Храпавіцкі звяртаецца ў допісе за 19 красавіка, дзе адзначана: «*Прыйшло паведамленне, што Хаванскі, страціўшы два штурму, стаіць з войскам у некалькіх мілях ад Ляхавічаў* [5, с. 236]». У гэтым запісу акцэнтуем увагу на тым, што, па звестках, якія меліся ў Храпавіцкага, мелі месца два штурмы Ляхавіцкай фартэцыі. Але з данясенняў Хаванскага цару вядома толькі пра адзін штурм 5 красавіка. Пасля яго ваявода назапашваў сілы, трымаючы крэпасць у аблозе. Цікавая і другая частка запісу Храпавіцкага аб перасоўванні Хаванскага на некалькі міль. Праўдападобна, што гаворка тут ідзе пра выправы маскоўскага войска супраць бліжэйшых літоўскіх аддзелаў, дыслацыраваных пад Нясвіжам [3, с. 162].

Наступныя звесткі з Ляхавічаў трапляюць у поле ўвагі Храпавіцкага 4 мая. Ён адзначае, «*што Хаванскі пад Ляхавічамі застаецца…* [5, с. 240]». І гэтая частка запісу з'яўляецца самай праўдзівай. Далей ідуць звесткі, якія не адпавядалі рэчаіснасці: «*…які ў штурмах колькі тысяч войска страціў, і быў забіты яго сын, падстрэлены пад самага каня* [5, с. 240]». Не выклікае сумневу, што лічба страчаных ваяводам жаўнераў у «колькі тысяч» у некалькіх штурмах (на гэты час штурм быў адзін) яўна перабольшаная. Не праўдзівымі з'яўляюцца звесткі і аб тым, што быў забіты сын Хаванскага.

Апошнія заметкі аб Ляхавіцкай аблозе Храпавіцкім занатаваныя 8 мая: «*прыйшло паведамленне, што Хавансці стаіць у паўмілі ад Ляхавічаў з войскам* [5, с. 240]».

Цікавы той факт, што Храпавіцкі нічога не адзначыў у сваіх запісах аб другім штурме Ляхавіцкай фартэцыі: 24 мая пачалася новая атака на ляхавіцкія бастыёны, якая закончылася няўдачай для маскоўскага войска [4, с. 33].

На вайсковай нарадзе Рэчы Паспалітай у Варшаве 24–30 мая было вырашана распачаць паход на дапамогу абаронцам Ляхавіцкай фартэцыі. У паход рушылі харугвы Паўла Сапегі і Стэфана Чарнецкага, якія 24 чэрвеня аб'ядналіся ў ваколіцах Слоніма. Насустрач аб'яднанаму войску выйшла войска Хаванскага. Сустрэліся яны 28 чэрвеня 1660 г. каля в. Палонка, дзе адбылася рашаючая бітва, у якой перамагло літоўска-польскае войска [3, с. 189, 207].



Рэпазіторый БДУ

Перамога пад Палонкай была адлюстраваная Я. А. Храпавіцкім у запісе ад 5 ліпеня. Навіны аб перамозе прыйшлі ад Уладзіслава Скарашэўскага (пасланец у Варшаву С. Чарнецкага). Адзначана: «*28 чэрвеня ў панядзелак у вігілію святога Пятра і Паўла, наша войска разбіла Хаванскага, які з тыранскай пыхаю недаацэньваў нашае войска, выйшаўшы з табару з-пад Ляхавічаў, таго ж дня стаў пад Палонакй. Там жа Бог дабраславіў ягомасці пану гетману літоўскаму і ягомасці ваяводзе рускаму, што наша войска ў малым часе (бо толькі дзве з чвэрцю гадзіны тая патрэба трывала), хоць досыць мужна і моцна наступаў непрыяцель, перамагло і, разарваўшы пяхоту, якой 8000 стаяла, наша войска выйшла і кавалерыяй знясло. Сына Хаванскага і Змеява, і Шчарбатага ўзялі жыўцом. Сам Хаванскі і некалькі соцень вершнікаў уцяклі, не завітаўшы ў табар, дзе нашы займелі вялікую здабычу, як у жыўнасці, так і розных іншых дастатках. За Хаванскім выправіліся два палкі пад Барысаў, дзе той быў. Некалькі дзясяткаў гармат, а таксама ўся амуніцыя дасталася нашым* [5, с. 249–251]». Адзначым, што пададзеныя звесткі збольшага адпавядаюць рэальнай карціне падзей: бітва пад Палонкай цягнулася каля 3 гадзін, былі захопленыя ў палон маскоўскія афіцэры, Хаванскі адступіў на ўсход, баявы рыштунак, у тым ліку і гарматы, з-пад Ляхавічаў у кінутым маскоўцамі абозе, дасталіся пераможцам.

Такім чынам, разгледзеўшы дзённікавыя запісы Я. А. Храпавіцкага, якія датычацца абароны Ляхавіцкай фартэцыі ў вайсковай кампаніі першай паловы 1660 г. на літоўскім тэатры баявых дзеянняў, можна рэзюмаваць наступнае:

1) У запісах Храпавіцкага хоць і знайшлі адлюстраванне асноўныя падзеі, якія адбываліся ў перыяд вясны-лета 1660 г. каля Ляхавічаў (падыход маскоўскага войска, асада, штурм, выправа Хаванскага пад Палонку, яго адступленне), некаторыя падзеі засталіся не асветленыя: другі штурм, зняцце аблогі.

2) Звесткі з-пад Ляхавічаў, якія паступалі ў Варшаву да Храпавіцкага цягам усёй кампаніі мелі супярэчлівы характар. Галоўным чынам, да яго прыходзілі паведамленні аб непраўдзівых намерах Хаванскага пайсці ў наступ у розных напрамках. Таксама маецца шэраг іншых недакладных момантаў: пададзеная колькасць штурмаў, перабольшаная колькасць забітых салдат маскоўскага войска, звесткі аб гібелі сына ваяводы Хаванскага.

3) З нататак можна даведацца аб часе, як хутка навіны з поля бітвы даходзілі да Варшавы. Так, у сярэднім, навіны даходзілі цягам тыдня, але бывалі выпадкі і большай затрымкі.

1. Акты Московского государства : в 3 т. – СПб., 1890–1901. – Т. 3 : Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 гг. – 1901. – 674 с.
2. Бабулин, И. Б. Московские «легионы» на гравюре «Осада Ляхович в 1660 году» / И. Б. Бабулин // История военного дела: исследования и источники. – 2012. – Т. III. – С. 297–320.
3. Касажэцкі, К. Кампанія 1660 году ў Літве / К. Касажэцкі. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 332 с.
4. Курбатов, О. А. «Литовский поход 7168 года» князя И. А. Хованского и битва при Полонке / О. А. Курбатов // Славяноведение. – 2003. – № 4. – С. 25–40.
5. Chrapowicki, J. A. Diariusz : w 2 cz. / J. A. Chrapowicki ; oprac. T. Wasilewski. – Warszawa : Pax, 1978. – Cz. 1 : Lata 1656–1664. – 664 c.
6. Nowosad, W. Diariusz Jana Antoniego Chrapowickiego jako źródło do badań klimatu Rzeczypospolitej w drugiej połowie XVII wieku / W. Nowosad, R. Przybylak, K. Marciniak, K. Syta // Klio – Czasopismo Poświęcone Dziejom Polski i Powszechnym. – 2007. – № 9. – С. 21–60.

**Пушков В.П.**

## БЕЛОРУСЫ НА МОСКОВСКОМ ПЕЧАТНОМ ДВОРЕ В XVII ВЕКЕ (ПО АРХИВУ ПРИКАЗА КНИГОПЕЧАТНОГО ДЕЛА)

Московский печатный двор (МПД) в продолжение целой трети века с 1632 по 1664 г. вел не имеющую аналогов в мире запись розничной («в мір») продажи своих книг через типографскую лавку на Никольской улице. Соответствующие «приходные книги» содержат персональные сведения с указанием чинов и званий многих тысяч покупателей и десятках тысяч купленных ими книг (ежегодно примерно из 80 городов) [1, 2, 3]. По построенным нами двум электронным базам данных [5, 6], между которыми пролегла четверть века, встречаются и белорусские читатели. Так, в среду 9 ноября 1636 г. «полоченин» Владимир купил Псалтырь с восследованием, а в понедельник 3 сентября 1662 г. «витябченин» Илья Сатков взял Евангелие напрестольное.



Репозиторий ВГУ